# *Тэма 2 ПРЫНЦЫПЫ, МЕТАДЫ, ПРЫЁМЫ І ФОРМЫ НАВУЧАННЯ ЛІТАРАТУРЫ*

1 Прынцыпы навучання літаратуры.
2 Метады і формы навучання літаратуры.
3 Прыёмы навучання літаратуры.

## 1 Прынцыпы навучання літаратуры

**Прынцыпы навучання** – гэта асноўныя тэарэтычныя палажэнні, якімі кіруецца настаўнік пры выбары зместу, метадаў, прыёмаў і форм навучання, г.зн. пры распрацоўцы адукацыйнай тэхналогіі.

**Агульнадыдактычныя прынцыпы:**

1) прынцып навуковасці;
2) даступнасці;
3) нагляднасці;
4) сістэматычнасці і паслядоўнасці;
5) пераемнасці і перспектыўнасці;
6) выхаваўчай накіраванасці навучальнага працэсу;
7) свядомасці і актыўнасці;
8) сувязі навучання з жыццём;
9) трываласці;
10) прынцып міжпрадметных сувязей.

**Прынцыпы літаратуразнаўчага аналізу:**

1 Прынцып вывучэння літаратуры як мастацтва слова.
2 Прынцып аналізу мастацкіх з'яў у адзінстве іх зместу і формы.
3 Прынцып гістарызму.

Акрэсленыя прынцыпы маюць роўнавялікае значэнне і таму павінны ўжывацца комплексна. Недаацэнка таго ці іншага прынцыпу зніжае эфектыўнасць навучання.

## 2 Метады і формы навучання літаратуры

Сапраўдным прафесіяналам можа стаць толькі той настаўнік, які пры належнай эрудыцыі і глыбокіх ведах дасканала валодае методыкай навучання, г. зн. сістэмай метадаў выкладання свайго прадмета.

**Метад** – гэта сістэма паслядоўных узаемазвязаных дзеянняў настаўніка і вучняў, якая забяспечвае засваенне зместу адукацыі. У айчыннай метадычнай навуцы найбольшае распаўсюджанне атрымалі наступныя *класіфікацыі* метадаў:

1) <u>па крыніцы атрымання ведаў</u> вылучаюць
- **славесныя** (чытанне, пераказ, гутарка, лекцыя, слова настаўніка),
- **наглядныя** (ілюстрацыя, дэманстрацыя),
- **практычныя** (розныя віды дзейнасці вучняў) метады;

2) <u>па характары дзейнасці настаўніка і вучняў і ступені іх самастойнасці</u> (**творчага чытання, рэпрадуктыўны, эўрыстычны, даследчы**).

3) У асобную групу вылучаюцца **метады кантролю** за вучэбнай дзейнасцю вучняў:
- <u>метады вуснага</u> (індывідуальнае і франтальнае апытванне, вусны залік),
- <u>пісьмовага</u> (сачыненне, літаратурная дыктоўка, тэст, пісьмовы залік),
- <u>машыннага кантролю</u> (з дапамогай камп'ютара) і інш.

Ахарактарызуем асноўныя метады.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**І класіфікацыя**

**Метад чытання** – адзін з асноўных на ўроку літаратуры. Ён павінен мецць месца на кожным уроку. Чытанне твора ажыццяўляецца, як мінімум, два разы. Нельга пераацаніць яго ролі і значэння для развіцця асобасных якасцей вучняў. На жаль, многія настаўнікі з-за абмежаванасці колькасці гадзін, адведзеных праграмай на ўрокі літаратуры, рэалізуюць яго толькі ў адным прыёме: дамашнім чытанні вучняў, што ва ўмовах панавання тэлебачання і камп'ютараў дае несуцяшальныя вынікі.

**Метад пераказу**, як правіла, рэалізуецца на апошняй ступені вывучэння мастацкага твора і мае важнае значэнне для развіцця вуснага маналагічнага маўлення вучняў. Як правіла, патрабуе папярэдняй падрыхтоўчай работы, асабліва ў 5–7 класах. Пераказ павінен завяршаць аналіз тэксту. Матэрыял для пераказу ўскладняецца ад класа да класа: у старэйшых класах для пераказу адбіраюцца аўтарскія адступленні і характарыстыкі, лірычныя маналогі герояў, пейзажныя замалёўкі, філасофскія разважанні. Неабходна сачыць, каб вучні пры пераказе захоўвалі паслядоўнасць і ўзаемасувязь паміж часткамі, вылучалі і падкрэслівалі галоўнае, адбіралі важныя дэталі. Акрамя таго, трэба звяртаць увагу на "раўнамернасць" пераказу, не дапускаць залішніх падрабязнасцей у адной частцы і сціскання іншай.

Якасць **гутаркі** залежыць ад выканання наступных патрабаванняў:

1 Настаўнік павінен усведамляць канчатковую *мэту* гутаркі.

2 Прадумаць лагічную *сістэму пытанняў,* вызначыць аптымальную іх колькасць.

3 *Карэктныя фармуліроўкі пытанняў,* іх празрыстасць, выразнасць: яны не павінны быць абагульненымі, штучнымі, двухсэнсоўнымі ці патрабаваць адназначнага адказу.

Гутарку пачынае ўступнае слова, а заканчвае падагульненне настаўніка (Заўвага: у канспекце яны не вылучаюцца ў якасці асобных структурных элементаў). У якасці перавагі выкарыстання гутаркі можна назваць магчымасць задзейнічаць увесь клас, актыўную дзейнасць вучняў; у якасці недахопаў – неэканомнасць часу. Гутарка часта спалучаецца з іншымі прыёмамі: выбарачным чытаннем, словам настаўніка і інш.

**Метад лекцыі**, які практыкуецца пад час тлумачэння новага матэрыялу ў старэйшых класах (15–20 хвілін), уяўляе сабой канцэптуальны і паслядоўны выклад вучэбнага матэрыялу настаўнікам. Лекцыя належыць да ліку самых эканомных метадаў: за адносна невялікі час яна дазваляе падаць вучням даволі вялікі матэрыял. З другога боку, гэта адзін з метадаў, пры якім вучні займаюць пасіўную пазіцыю. Асноўныя адрозненні школьнай і ўніверсітэцкай лекцыі наступныя: працягласць, меншая складанасць і аб'ём матэрыялу; непасрэдны зварот да слухачоў; падача матэрыялу блокамі, паміж якімі выкарыстоўваюцца іншыя прыёмы і формы работы; суправаджэнне вербальнай інфармацыі метадам дэманстрацыі з мэтай уздзеяння на розныя органы пачуццяў школьнікаў; "белетрызаваны" аповед; абавязковае задзейнічанне вучняў у актыўным успрыманні лекцыі праз практычныя прыёмы работы. Да метаду лекцыі мэтазгодна звяртацца пры вывучэнні матэрыялу, які незнаёмы ці малазнаёмы вучням, разглядаючы аб'ёмную ці складаную тэму: жыццёвы і творчы шлях пісьменніка, уводныя і аглядавыя тэмы (да прыкладу, характарыстыкі пэўнага перыяду развіцця літаратуры).

**Слова настаўніка (каментар)** – гэта вуснае выступленне настаўніка (да 5-ці хвілін), раскрыццё нейкага аспекту тэмы. *Патрабаванні:* правільнасць, дакладнасць, лаканічнасць, выразнасць, змястоўнасць.

Розніца паміж лекцыяй і словам настаўніка:

- працягласць;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

- лекцыя раскрывае пытанне канцэптуальна, слова настаўніка закранае толькі пэўны аспект тэмы ўрока;
- лекцыя абавязкова спалучаецца з іншымі метадамі (складанне плана лекцыі, тэзісаў, канспекта і інш.).

**Метад ілюстравання** выкарыстоўваецца на кожным уроку. Існуе некалькі відаў нагляднасці: слыхавы, зрокавы, мастацка-выяўленчы, графічны, славесна-вобразны, камбінаваны. Галоўныя *патрабаванні*:

а) уся нагляднасць, прадстаўленая на дошцы, павінна быць выкарыстана;

б) нагляднасць павінна дакладна адпавядаць зместу і эмацыянальнаму настрою твора.

Аднак жаданне ўпрыгожыць урок узорамі выяўленчага мастацтва і музыкі не павінна ператварыцца ў самамэту і адсунуць літаратурныя задачы на другі план.

**Дэманстрацыя** – выкарыстанне ТСН (тэле-, дыя-, відэа-, кінафільмы, слайд-прэзентацыя, кампутар). У большасці выпадкаў яна павінна суправаджацца апераджальным заданнем, што надасць прагляду мэтанакіраванасць.

Калі наглядныя і славесныя метады грунтуецца на аснове дзеянняў настаўніка ці настаўніка разам з вучнямі, то **практычныя метады** (яны ж прыёмы) прадугледжваюць найперш дзейнасць вучняў.

**II класіфікацыя.**

**Метад творчага чытання** мае сваёй задачай выхаванне ўдумлівага і зацікаўленага чытача. Задача яго – актывізацыя мастацкага ўспрымання, фарміраванне сродкамі мастацтва эстэтычных перажыванняў. Метад творчага чытання найбольш спецыфічны для літаратуры як вучэбнага прадмета.

**Эўрыстычны**, або часткова пошукавы, метад мае на мэце развіццё навыкаў самастойнай работы, аналітычнага і лагічнага мыслення. У мастацкім творы ўздымаюцца маральна-этычныя, філасофскія, ідэалагічныя праблемы, раскрыццю якіх і садзейнічае эўрыстычны метад. Ён выкарыстоўваецца практычна заўсёды пры аналізе мастацкага твора.

**Даследчы метад** ставіць задачай выхаванне даследчыка літаратуры і рэалізуецца, як правіла, у старэйшых класах, бо патрабуе большай самастойнасці вучняў. Роля настаўніка зводзіцца да падрыхтоўчай і кансультатыўнай работы: ён распрацоўвае план семінарскіх заняткаў, рыхтуе тэматыку паведамленняў, прапаноўвае спіс літаратуры і г. д. Даследчы метад мае шмат агульнага з эўрыстычным, але прадугледжвае і больш высокі ўзровень складанасці заданняў, больш глыбокае асэнсаванне літаратурных з'яў.

**Рэпрадуктыўны метад** прадугледжвае атрыманне вучнямі ведаў у гатовым выглядзе з вуснаў настаўніка ці тэкставых крыніц. Спецыфіка рэпрадуктыўнага метаду ў рэтрансляцыі ведаў ад настаўніка вучням, што прадугледжвае найменшую актыўнасць навучэнцаў. Гэта не азначае, аднак, што рэпрадуктыўны метад горшы ў параўнанні з астатнімі і што настаўнік павінен карыстацца ім у меншай ступені. Так, некаторыя пытанні курса літаратуры не могуць быць раскрыты пры дапамозе эўрыстычнага і даследчага метадаў: біяграфія пісьменніка, дэфініцыі тэарэтычных паняццяў, агульныя заканамернасці развіцця літаратуры пэўнага перыяду і інш. Акрамя таго, недахопамі эўрыстычнага і даследчага метадаў з'яўляецца неэканомнасць часу і немагчымасць забеспячэння дастатковай шырыні і сістэмы ведаў.

Метады навучання трэба адрозніваць ад **форм** работы.

Адным з патрабаванняў да якасці ўрока з'яўляецца разнастайнасць і чаргаванне розных **форм работы**:

- ✓ індывідуальнай, парнай, групавой;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

- ✓ вуснай, пісьмовай і графічнай працы;
- ✓ франтальнай і самастойнай працы;
- ✓ апераджальных заданняў;
- ✓ чытання ўголас, моўчкі, разам;
- ✓ дыдактычных і дзелавых гульняў, віктарын, конкурсаў;
- ✓ работы ў сшытках, на картках, на дошцы, з падручнікам і інш.

## 3 Прыёмы навучання літаратуры

Частка метаду, прыватнае яго праяўленне называецца **прыёмам**. Менавіта чаргаваннем розных прыёмаў і форм работы, нават у межах аднаго метаду, можна дасягнуць разнастайнасці ўрокаў літаратуры.

**Метад чытання** рэалізуецца ў наступных прыёмах:

А) <u>паводле выканання</u>: чытанне настаўніка, вучняў, аўтара і майстроў слова;

Чытанне настаўніка (пры першасным успрыманні тэксту) з'яўляецца ўзорам для вучняў, таму ён павінен бездакорна валодаць тэхнікай чытання. У 5 – 6 класах творы абавязкова чытаюцца настаўнікам у класе. У 7 – 8 класах чытанне настаўніка можа насіць эпізадычны характар, у 9 – 11 – рэалізацыя гэтага прыёму залежыць ад мэты ўрока і агульнай падрыхтаванасці класа. Выключэнне складаюць лірычныя творы, узор чытання якіх абавязкова павінен падавацца настаўнікам на ўсіх этапах літаратурнай адукацыі, бо толькі дарослы чалавек можа з належнай глыбінёй і дакладнасцю перадаць складанасць аўтарскіх перажыванняў. Гэткім жа чынам адбываецца градацыя складанасці і аб'ёму самастойнага чытання вучняў па класах. Чытанне аўтарам і майстрамі слова (у грамзапісе) трэба прымяняць на заключным этапе вывучэння твора, калі вучні выпрацоўваюць навыкі выразнага чытання, з мэтай параўнання інтэрпрэтацыі прафесійнага чытання і ўласнага разумення тэксту. Не рэкамендуецца праводзіць першаснае знаёмства з вершам праз грамзапіс. Аргументаў на карысць гэтай думкі шмат: найбольшае ўздзеянне аказвае непасрэдны кантакт са слухачом, жывое маўленне (параўнайце: чытанне прафесійным артыстам са сцэны, калі глядач можа назіраць найтанчэйшыя нюансы настрою, выяўленыя з дапамогай мімікі і жэстаў). Па-другое, эмацыянальны эфект можа канчаткова разбурыцца праз няякасны запіс ці тэхнічныя непаладкі пад час праслухоўвання верша.

Б) <u>па месцы правядзення</u>: класнае і дамашняе;

Класнае чытанне, як ужо гаварылася вышэй, павінна стаць абавязковым элементам на кожным уроку. Акрамя таго, што ў сучаснай школе для многіх вучняў яно з'яўляецца, на жаль, адзіным спосабам далучыцца да твора, класнае чытанне карыснае і для добрасумленных вучняў. Пры класным чытанні ўзнікае калектыўнае суперажыванне, вучні трапляюць пад уздзеянне эмацыйнасці мастацкага слова.

У сваю чаргу, дамашняе чытанне дазваляе не толькі азнаёміцца са зместам буйнога твора, але і вызначаецца інтымнасцю перажыванняў і індывідуальным успрыманнем зместу твораў.

В) <u>па спосабах дзеяння</u>: выбарачнае, каменціраванае чытанне, выразнае чытанне і завучванне на памяць, чытанне па ролях.

Выбарачнае чытанне прадугледжвае чытанне асобнай сцэны, эпізоду, страфы, невялікага ўрыўку тэксту для падмацавання свайго адказу цытатай, аргументацыі думкі.

Каменціраванае чытанне – гэта чытанне твора (вялікага – адносна закончанымі ўрыўкамі) у спалучэнні з пэўным каментарам: тлумачэннем тэматыкі, праблематыкі, ідэйнага зместу, мастацкай адметнасці, паданнем гістарычнай даведкі (часу напісання або часу дзеяння ў творы), каментарыем незразумелых слоў і выразаў і інш. Каментар

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

можа ажыццяўляцца з дапамогай гутаркі, слова настаўніка, паведамленняў вучняў (апераджальных заданняў). Каменціраванае чытанне, як правіла, выкарыстоўваецца пры паўторным чытанні тэксту. Выключэнне – творы старажытнай літаратуры, складаныя для ўспрымання вучнямі, і драматычныя тэксты.

Выразнае чытанне і завучванне на памяць рэалізуецца на апошняй стадыі вывучэння тэксту, калі твор добра асэнсаваны.

Чытанне па ролях ажыццяўляецца ў дачыненні да драматычных, эпічных твораў дыялагічнай будовы, баек. Чытанне па ролях рыхтуецца загадзя: размяркоўваюцца ролі, праводзіцца (па магчымасці) рэпетыцыя. Выкарыстоўваецца пасля аналізу.

**Метад пераказу** прадугледжвае выкарыстанне наступных **прыёмаў**:

А) падрабязны пераказ, які патрабуе выкарыстання лексікі і сінтаксічных канструкцый аўтарскага тэксту.

Б) сціслы пераказ, калі вучні засяроджваюцца на самым галоўным і карыстаюцца сваімі словамі. Можа выкарыстоўвацца, на этапе праверкі першаснага ўспрымання тэксту сярэдняй і буйной эпічнай формы ў старэйшых класах.

В) выбарачны пераказ, які дае магчымасць засяродзіцца на галоўным эпізодзе, адной сюжэтнай лініі, адным персанажы, пэўным апісанні. Карысны найперш пры падрыхтоўцы да сачыненняў.

Г) творчы пераказ, спецыфіка якога ў змене асобы, ад імя якой вядзецца апавяданне ў творы, або змене аповеду, замене дыялагічнай будовы тэксту маналагічнай і наадварот.

Д) мастацкае расказванне дазваляе больш вольна абыходзіцца з тэкстам: змяняць парадак эпізодаў, змяняць або дадумваць канцоўку твора, падрабязна распрацоўваць эпізод, не раскрыты аўтарам. Праўда, многія метадысты указваюць на неабходнасць асцярожнага абыходжання з тэкстам. Так, яны не рэкамендуюць прыдумваць уласныя канцоўкі ці новыя эпізоды, бо гэта можа парушыць канцэпцыю твора, яго ідэйны змест.

Е) славеснае маляванне – вуснае апісанне статычнай карціны паводле пэўнага эпізоду тэксту. Вучняў трэба навучыць апісанню, выкарыстанню паняццяў “на першым плане”, “у цэнтры”, “на заднім плане”, звярнуць увагу на каларыстыку карціны.

**Гутарка** бывае рэпрадуктыўная, эўрыстычная і вольная.

Рэпрадуктыўная гутарка патрабуе ўзнаўлення наяўных тэарэтычных ведаў па тэме, па змесце мастацкага тэксту ці літаратурна-крытычнага артыкула і інш.

У працэсе эўрыстычнай гутаркі вучні шляхам разважанняў здабываюць новыя веды, робяць уласныя высновы і абагульненні.

Вольная гутарка, або дыскусія, грунтуецца на неадназначных, спрэчных пытаннях па тэме і дапаўняецца пытаннямі вучняў пад час яе правядзення. Свабодная структура гэтага віду гутаркі не азначае адсутнасці яе арганізацыі настаўнікам. Ён павінен прадумаць папярэдні план, агульны накірунак дыскусіі, магчымасць пытанняў з боку вучняў.

Асноўныя віды дыскусіі:

- “*сумесны пошук*”: абмеркаванне стрыжнявога пытання ці праблемы твора;
- “*перакрыжаваная дыскусія*”, *або дыспут,* – сутыкненне супрацьлеглых пунктаў погляду.

Пачынаецца дыскусія з пастаноўкі *праблемнага пытання*. Сфармуляваць зыходны тэзіс дыскусіі можна ў якасці сцверджання ці пытання. Прыклад: Я. Купала “Магіла льва”: Забойства Наталькай Машэкі – гэта подзвіг ці злачынства? Або В. Дунін-Марцінкевіч “Пінская шляхта”: Грышка і Марыся – гэта ідэальныя героі.

Існуюць і прыватныя прыёмы **метаду ілюстравання:**

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

- **Інсцэніраванне** рыхтуецца загадзя і можа выкарыстоўвацца на апошнім этапе вывучэння драматычнага ці эпічнага твора.
- **Мізансцэніраванне** прадугледжвае работу па размяшчэнні дзеючых асоб і дэкарацый на сцэне ў пэўныя моманты спектакля.

**Практычныя метады** рэалізуюцца праз наступныя **прыёмы**: складанне плана, тэзісы, рэферат, даклад, паведамленне, канспект, параўнанне, творчыя вусныя і пісьмовыя заданні, выкананне тэставых заданняў і інш.

Работа па складанні **плана** прадугледжвае падзел твора на закончаныя часткі, вызначэнне іх дакладных межаў і прыдумванне назваў да іх у адпаведнасці з абраным відам. Паводле структуры планы могуць быць простымі і складанымі. У залежнасці ад фармуліроўкі загалоўкаў вылучаюць план-пытанні (пытальныя сказы), план-загалоўкі (назыўныя сказы), план-тэзісы (апавядальныя сказы) і цытатны план. Кожны з відаў мае свае перавагі і недахопы, якія неабходна ўлічваць пры выбары таго ці іншага віду. Найбольш дзейсным пры падрыхтоўцы вучняў да падрабязнага пераказу, да прыкладу, лічыцца выкарыстанне цытатнага плана, які, па сутнасці, з'яўляецца схематычным пераказам зместу, ці плана-пытанняў. План можа выкарыстоўвацца на заключным этапе як падрыхтоўка да пераказу, так і на арыентацыйных занятках з мэтай дапамагчы школьнікам запомніць твор, выявіць яго кампазіцыйную будову. Складанне плана павінна адбывацца не толькі ў дачыненні да мастацкіх тэкстаў, але і да літаратурна-крытычных артыкулаў, што дазволіць спасцігнуць яго асноўныя думкі.

**Рэферат** – гэта аб'ектыўны кароткі выклад зместу адной ці некалькіх літаратуразнаўчых крыніц, а ў **дакладзе** абавязковым элементам з'яўляецца суб'ектыўная (вучнёўская) ацэнка гэтых крыніц. **Паведамленне** – загадзя падрыхтаванае кароткае вуснае выступленне вучня па прапанаванай тэме. І рэферат, і даклад патрабуюць ад настаўніка пэўнай падрыхтоўкі. Неабходна не толькі лаканічна і ясна сфармуляваць тэму рэферата (даклада), але і прапанаваць план і прадставіць спіс літаратуры і інтэрнэт-сайтаў, дзе вучань можа адшукаць патрэбную інфармацыю. Калі рэферат (даклад) патрабуе звароту да некалькіх манаграфій, то неабходна ў спісе літаратуры пазначыць старонкі (раздзелы), іншымі словамі, звузіць кола крыніц. Змест рэферата (даклада) правяраецца ДА ўрока, каб ацаніць эфектыўнасць выкарыстання гэтага прыёму на ўроку.

**Тэзісы** – асноўныя палажэнні, якія сцісла перадаюць канцэпцыю даклада, лекцыі, артыкула і інш. **Канспект** прадугледжвае не толькі запіс асноўных думак, але і іх аргументацыю. Выкарыстоўваюцца пры правядзенні лекцыі, у працэсе працы з літаратурна-крытычным артыкулам для свядомага асэнсавання новага матэрыялу ці праверкі глыбіні яго засваення.

**Параўнанне** – адзін з самых эфектыўных метадаў, які можа ажыццяўляцца ў вуснай, пісьмовай і графічнай форме ў адносінах да розных літаратурных з'яў: сцэн, эпізодаў, вобразаў-персанажаў, пейзажу, асобных твораў, стылю розных пісьменнікаў, твора літаратуры і твора сумежнага роду мастацтва і інш. Паводле формы бывае двух відаў: супастаўленне і супрацьпастаўленне; паводле зместу падзяляецца на гісторыка-літаратурнае, тэарэтыка-літаратурнае, культуралагічнае і інш. Пры арганізацыі гэтага прыёму настаўнік абавязкова павінен указаць крытэрыі параўнання.

**Выснова:** Адным з важнейшых складнікаў педагагічнага майстэрства настаўніка з'яўляецца ўменне абраць, улічваючы канкрэтныя ўмовы работы школы, асаблівасці класа і спецыфіку матэрыялу, найэфектыўнейшыя метады і прыёмы работы. Стварыць якасны ўрок немагчыма без чаргавання розных метадаў, форм і прыёмаў работы. Акрамя таго, у практыцы школьнага выкладання літаратуры яны часта камбінуюцца.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ